# Фота сэрцам убачанай Беларусі

***У рамках праекта «Малая радзіма – аповесць часоў» 26 сакавіка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшоў заключны этап фотапраекта «Я сэрцам бачу». Тэлеканал «Беларусь 24» сумесна з НББ прадставіў фотапрацы прафесіяналаў і аматараў з розным бачаннем роднай зямлі, чые здымкі адзначаліся выданнямі «National Geographic» і «The Daily Telegraph», міжнароднай прэміяй «35 Awards».***

Цягам першых двух этапаў наведнікі экспазіцыяў маглі пазнаёміцца з творамі ўдзельнікаў фотапраекта і прагаласаваць за ўпадабаныя здымкі. Дыпломамі ўзнагароджаныя тыя, чые працы спадабаліся большай частцы аўдыторыі. Пераможцам першага этапу стаў фатограф, рэжысёр і аператар, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне кіно і тэлебачання Ігар Бышнёў за зімовы здымак рудой гаспадыні беларускіх лясоў – «Ліса». Пераможцам другога этапу стаў фатограф у тэхніцы таймлапс і відэааператар Дзмітрый Важнік за здымак начнога Мінска з вышыні птушынага палёту – «Цэнтр».

Віншуючы пераможцаў, першы намеснік дырэктара НББ Алена Даўгаполава адзначыла, што Год малой радзімы стаў падставай для супрацоўніцтва розных арганізацыяў і падарыў нямала цікавых праектаў. Віталі ўдзельнікаў фотапраекта галоўны дырэктар тэлеканала «Беларусь 24» Аляксандр Мартыненка, загадчыца аддзела маркетынгу і прамацыравання тэлеканала «Беларусь 24» Арына Барысёнак.

На выстаўцы, што працягнецца да 30 красавіка, прадстаўленыя здымкі 14-і фотамастакоў – удзельнікаў мінулых этапаў: І. Бышнёва, Ільі Гелея, Станіслава Багдзевіча, Сяргея Плыткевіча, Кацярыны Міцінай, Юліі Войніч, Д. Важніка, Максіма Вейзэ ды іншых.

***Паводле паведамлення аддзела сувязяў з грамадскасцю Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі***
***Фота з сайта nlb.by***



Аляксандр Мартыненка

